Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 22 (404) Субота, 19 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у аўторак, чацьвер і суботу. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена. Менск, Комсам. 25

Заваюем балотныя прасторы!

Ёсьць дзедаўская даўнейшая расійская пагаворка, што.. „Наша земля велика и обильна, а порядка в ней нет“.

Кастрычнік 1917 году на нашу зямлю навёў парадкі, але яшчэ шмат і шмат нам прыдзецца папрацаваць над тым, каб на зямлі (ня ў пераносным, а сапраўдным сэнсе гэтага слова) устанавіць добрыя парадкі.

Балоты ў Беларусі займаюць значны кавалак зямельнага абшару.

Напрыклад, статыстычныя даведкі кажуць аб тым, што калі-б асушыць усе балоты на Беларусі дык можна было-б кожнай сялянскай сям'і дадаць яшчэ па 4 дзесяціны зямлі.

Зараз над заваёваю балотных прастораў акрамя дзяржаўных установ працуе шэраг мэліорацыйных таварystваў (у 1924 годзе было 254 мэліорацыйных таварystваў, а ў мінулым годзе ўжо 560).

Але ўсё гэта капля вады ў моры, гэта яшчэ недастаткова.

Гэтая праца павінна штодзённа пашырацца.

Нам трэба заваяваць балота.

Добрымі словамі, прыгожай пісанінай гэтага ня зробіш.

Патрэбна ўпартасьць і энэргія.

І ў гэтай галіне гаспадарчай працы нашы вясковыя комсамольцы павінны прымаць непасрэдны ўдзел, праз падтурхваньне думкі аб неабходнасьці організацыі мэліорацыйных таварystваў, праз практычны ўдзел у іх першымі дающы прыклад.

У нашага вядомага пісьменьніка Якуба Коласа ёсьць адно апавяданьне, у якім ён малюе барацьбу з балотам.

Спакон вякоў ляжыць гіблае месца, гнілое балота. Яно займае вялікую плошчу. Ні чалавек, ні жывёла ня могуць ступіць на глебу гнілога балота. Але вось у вёску на летні час прыяжджае Сьцяпан Баруша, мясцовы хлопец, які вучыцца ў горадзе на рабфаку. Ён організоўвае моладзь для барацьбы з балотам. Хлопцы і дзяўчаты выходзяць капаць канавы. Праца пашла. Выгляд балота зьмяніўся,—яно зрабілася шырокім квітнеючым лугам...

Нам патрэбна дабіцца такога становішча, каб прыклады, якія мы знаходзім у апавяданьні, таксама здараліся і ў жыцьці, сустракаліся на кожным кроку нашай працы.

У гэтым нумары зьмяшчаецца цэлая старонка, у якой працаўнікі Менскай балотнай станцыі высьвятляюць вопыт сваей дзейнасьці.

Лічбы, якія прыводзяцца ў артыкулу працаўнікоў, станцыі яскравей за ўсё кажуць аб тым вялікім значэньні, якое мае для народнай гаспадаркі асушка балот.

Мы вельмі мала атрымоўваем ад нашых юнкораў допісаў аб удзеле вясковых комсамольцаў у мэліорацыйных таварystвах аб пачынаньнях асобных комсамольскіх ячэек па асушцы балот і г. д.

Юнкорам трэба падрабязгова высьвятляць вопыт працы мэліорацыйных таварystваў.

Удзел у мэліорацыі, у асушцы балот зьяўляецца адным з вялікіх зьвеньняў куючагася зараз „ланцужка“, імя якога—узмацненьне, пашырэньне народнай гаспадаркі.

Хлопцы, падобныя да Сьцяпана Баруша, павінны сустракацца ня толькі ў апавяданьні Якуба Коласа,—кожны комсамолец, кожны малады працоўны селянін павінен быць барацьбітом за мэліорацыю.

Больш увагі заваёве балотных прастораў!

Рэпрэсыі ў Польшчы.

Разгром Віленскага т-ва Беларускае Школы.

Усе кіраўнікі т-ва арыштаваны.

Мясцовая організацыя «Таварystва Беларускае Школы» разгромлена польскай уладай. У членаў організацыі зроблены вобыскі. Усе кіраўнікі організацыі арыштаваны і пасаджаны ў турму. Паліцыя захапіла грошы і ўсе дакуманты.

Беларускія дэпутаты на Лукішках.

15-га лютага віленскі прокурор у першы раз пасьля паходу на Грамаду дазволіў жонкам арыштаваных беларускіх дэпутатаў пабачыцца з арыштаванымі дэпутатамі.

Дэпутатам дазволілі гаварыць з жонкамі толькі 5 хвалін і то ў прысутнасьці вялікае паліцэйскае варты.

Чарговая «дэмакратычная вольнасьць».

У віленскай паштова-тэлеграфнай канторы ляжаць цэлыя горы лістоў і карэспандэнцый, адрасаваных у цэнтральны сакратарыят Грамады. Па загаду пракурора гэтая корэспондэнцыя не выдаецца Грамадзе,

Таксама ня перадаюцца Грамадзе грашовыя пераводы, па якіх перасылаюцца сяброўскія ўзносы ад сяброў провінцыяльных організацыяй Грамады.

Скасаваньне сэрвітутаў.

12-га лютага прэзыдэнт Польшчы падпісаў дэкрэт аб скасаваньні сэрвітутаў на абшарах Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Скасаваньне сэрвітутаў адаб'ецца на сялянскай насельнасьці Заходняй Беларусі і Украіны, якая дагэтуль заўсёды мела з абшарнікамі судовыя спрэчкі за права карыстаньня сэрвітутамі.

Па прыкладу вышэйшага начальства.

Віленская беларуская газэта «Наш Голас» (№ 6) піша, што нумары беларускіх газэт, якія праходзяць праз урадавую цэнзуру, усё-ж не даходзяць да чытатоў.

Загадчыкі розных паштовых кантор у мястэчках і сёлах па ўласнай ініцыятыве таксама конфіскуюць усе беларускія газэты, якія прыходзяць да іх пошты.

Не дазваляюць слова сказаць.



Школа ў Заходняй Беларусі

Па загаду польскага ўраду Заходняй Беларусі ў школах уведзена абавязковае выкладаньне на польскай мове, але дзеці не разумеюць гэтай мовы і патрабуюць, каб настаўнікі гаварылі з імі пабеларуску.

У вёсцы Тамальнае настаўніца Ніна Мамялюк па вечарох стала вучыць дзяцей польскай мове, а пакуль што выкладала ў школе на беларускай мове. Аднаго разу дзеці папрасілі расказаць пра Леніна. Настаўніца расказала што ведала аб Леніне, як аб правадыры працоўных, расказала аб тым, як адбылася ў Расіі Кастрычнікавае рэволюцыя і як цяпер жывуць рабочыя і сяляне ў Савецкай краіне.

Дзецям вельмі спадабалася апавяданьне іх любімай настаўніцы, тым больш на роднай мове. На другі-ж дзень па данясеньню сына мясцовага папа да яе на кватэру прышлі жандары і зрабілі вобыск, але нічога не знашлі. А раніцою настаўніцу знашлі на кватэры няжывою. Паліцыя забрала труп настаўніцы, цэлы дзень хавала яго ў Управе, а ўначы нябожчыцу кінулі ў рэчку.



ЖЫЦЬЦЁ ЗАМЕЖНАЙ МОЛАДЗІ

Італьянскі комсамол працягвае барацьбу.

ПРОВОКАЦЫЯ ЧЭХА-СЛАВАЦКІХ ЖАНДАРАЎ.

Новы налёт.

На Сакратарыят Цэнтральнага Камітэту Чэха-Славацкага Комсамолу ў Празе паліцыя зрабіла налёт. Паліцыйскія ўварваліся ў бугынак Цэнтральнага Камітэту Комсамолу і зрабілі пагалоўны вобыск, шукаючы сакрэтных ваенных матар'ялаў. Аднак, провокацыя чэха-славацкіх жандараў ня ўдалася, у памяшканьні ЦК нічога знойдзена ня было.

Англійскі комсамол за працаю.



Конгрэс Нямецкага Комсамолу.

Цэнтральны Камітэт Нямецкага Комсамолу склікае ў красавіку месяцы 10-ты зьезд нямецкага саюзу, які адбудзецца ў горадзе Гамбургу. Парадак цню конгрэсу наступны: 1) палітычнае становішча і даклад аб партыйным зьезьдзе, 2) даклад Цэнтральнага Камітэту і бліжэйшые задачы Нямецкага Комсамолу, 3) эканомічная барацьба і профсаюзная праца. Комсамол і чырвоны юнацкі фронт. 5) Даклад саюзу юных спартакоўцаў.

Пасьля конгрэсу Комсамолу Нямеччыны пачнецца ўсенямецкае сьвята Комсамолу, на якое зьедуцца ўсе комсамольцы Нямеччыны. Сьвята гэтае адбудзецца на Вялік-дзень у Гамбурзе.

Колькі моладзі аб'яднана ў профсаюзах

Бюро Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу профсаюзаў апублікавала лічбы колькасьці аб'яднаных у профсаюзах маладых рабочых ніжэй 18 гадоў: Нямеччына — 293.000, Чэха-Славакіі—10.000, Аўстрыя —10.000, Данія—6.500 і г. д. З лічбаў відно, што далёка ня ўся рабочая моладзь за мяжою організавана ў професыйныя саюзы. Вось чаму нашы братэрскія саюзы за мяжою у працягу ўжо некалькіх гадоў праводзяць узмацнёную кампанію за ўступленьне рабочай моладзі ў профэсыйныя саюзы.

Барацьба ў Кітаі.

Мукдэнскае войска ўвашло ў мясцовасьць Хэнань.

Прасоўваньне мукдэнцаў у Хэнань сустракае вялікія перашкоды. На поўначы ад Хэнані між мукдэнцамі і войскам У-Пэй-Фу адбылося ўжо некалькі боек. Каля Фын-Ло-Чэне (на поўнач ад Чанто) два палкі У-Пей-Фу перашкаджалі ўваходу мукдэнцаў і былі імі абяззброены.

Чырвоныя пікі (атрады сялянскае самаабароны) у стычках з мукдэнцамі ў раёне Чанто страцілі каля 2000 чал. забітых.

Войска У-Пей-Фу пакідае Хэнань.

Сілы мукдэнцаў, якія ўвашлі ў провінцыю Хэнань, складаюць каля 2000 чалавек. Часьці войск У-Пей-Фу адышлі на поўдзень.

Жанчжоў зараз будзе занята Кантонцамі.

Войска Сун-Чуан-Фана адступіла. Усё дзе да таго, што Кантонскае войска зараз займае сталіцу Чжэцзяна Ханчжоў.

Малады Кітай.



Юныя піонэры (гамінданаўская орг.) на вуліцах Кантону.

Маладыя Італьянскія фашысты.



Пад прыгнётам фашызму.

Новы паход Італьянскага фашызму кінуў у турмы шмат сяброў Італьянскага Комсамолу. Аднак, італьянскія таварышы ня гледзячы на вялізарныя цяжкасьці і тэрор, працягваюць сваю гэроічную працу. У адозвах да ўсяе моладзі, прысьвечаным Ленінскім днём, Італьянскі Комсамол піша: «Фашызм працягвае свае зьверствы... Ён рыхтуецца да вайны, у якую хоча кінуць масы працоўных. Мы ня хочам вайны і будзем супроць яе весьці барацьбу. Гэтыя адозвы былі зьмешчаны ў адным з нумароў газэты Італьянскага Комсамолу «Авангардыя», які выходзіць цяпер нелегальна. На буйных прадпрыемствах італьянскія комсамольцы вядуць вялікую агітацыю супроць пагрозы новай імпэрыялістычнай бойкі і зьверстваў італьянскіх фашыстых.

Ня гледзячы на арышты, ня гледзячы на тэроры і турмы італьянскі Комсамол жыве. І як раней, будучы загнаны ў глухое падпольле, ён працягвае сваю рэволюцыйную барацьбу.

Заработная плата вучняў у Нямеччыне

Газэта Нямецкага Комсамолу «Молодая Гвардия» паведамляе аб заробчай плаце вучняў на заводзе фірмы «Цэйс». Вось лічбы, які характарызуюць жабрацкую заробчую плату рабочай моладзі ў Нямеччыне: у першы год навучаньня вучань атрымоўвае 5 марак у тыдзень (марка—47 кап.), на другі год навучаньня — 6 марак у тыдзень, на 3-ці год—7 марак і на 4-ты год—8 марак у тыдзень.

СЬЛІЎКІ НА КУЗЬНЕЦКІМ МАСТУ.

Малады поэт Мікалай Румянцаў нядаўна еў сьліўкі на Кузьнецкім масту ў Маскве. Еў ёў вельмі ўважліва і пры гэтым сачыніяў вершы...

Вершы былі поўны лірычнага агню, яны апавядалі аб...

Але да справы. Нас, провінцыялаў, зразумела, цікавіць гісторыя са сьліўкамі на Кузьнецкім масту. Як гэта Мікалай Румянцаў апыніўся ў Маскве і як гэта раптам—сьліўкі... І яшчэ: ці смачныя былі гэтыя сьліўкі, ці спадабаліся яны нашаму паважанаму поэту?...

Дык вось: комсамолец—поэт Мікалай Румянцаў жыў у горадзе Гомеле. Быў актывістым. Працаваў кіраўніком спраў акругкамолу і тэхсакратаром парт'ячэйкі Гарана. Кіраваў яшчэ Гомельскай сэкцыяй ВАПП (усесаюзная асоцыяцыя пролетарскіх пісьменьнікаў). І нарэшце—пісаў вершы. Праўда, вершы былі ня вельмі высокай якасьці. Напэўна наш менскі цэкіст характарызаваў-бы іх гэтак: «ёсьць шмат дасягненьняў, але і шмат недахопаў».

І вось, жывучы такім манерам у горадзе Гомеле Мікалай Румянцаў не сумаваў. Днем падшываў комсамольскія справы, а вечарам падшываў рыфмы. Затым піў піва, чытаў нарасьпеў Есеніна, ухмыляўся шматлікавым «літаратурным дзявіцам» (ёсьць такая парода!) і наогул быў шчасьлівы. Гэта «безмятежное существование» працягвалася-бы даволі доўга, але яму памяшаў ЦВК. Гэты ЦВК узяў да і прылучыў Гомельшчыну да Беларусі. Прылучыў—і, галоўнае, не запытаўся аб гэтым у Мікалая Румянцава—старшыні сэкцыі ВАПП, кіраўніка спраў акругкамолу і іншае, і іншае...

Прачнуўшыся аднойчы ў Беларускай ССР і даведаўшыся аб гэтым з газэты, Мікалай Румянцаў заметаўся па гораду з шаленымі вачыма, спыняў знаёмых з пытаньнем «як гэта табе спадабаецца» і стукаючы кулаком у грудзі хрыпла паўтараў бясьмертны есенінскі радок:

«Ах увял головы моей куст...»

Затым гэта бурны настрой зьмяніўся пэрыодам «тихого помешательства» Румянцаў асунуўся і ў вачох яго патухлі агенькі натхненьня. Няўжо яму прыдзецца астацца ў гэтай адсталай рэспубліцы?

Яму, Румянцаў, у якога «шмат дасягненьняў і шмат недахопаў»! Не, ніколі!

І, сапраўды, Румянцаў хутка атрымаў паперку з Масквы і згінуў... **разам з быўшымі ў яго сяброўскімі ўзносамі парт'ячэйкі і райкамолу на суму 600 рублёў.**

Вы скажыце, што гэта крымінальны ўчынак. Памыляецеся! Гэта проста поэтычная вольнасьць. Яшчэ Есенін аб гэтым казаў:

«Потому что без этих чудачеств
Я прожить на земле не могу...»

Гомельчане ўжо атрымалі весткі аб іх гэроі—Мікалаю Румянцаву. Ён напісаў цікавы ліст свайму таварышу Д. Тут ён паведамляе, што хутка едзе на працу ў Растоў на Дану, а пакуль «пристраивает халтурки в журналы». Праводзіць час у Маскве ня кепска. «Кушал сливки на Кузнецком мосту, пил портвейн—1 руб. 50 коп. четверть, ходил в театры». Сваім учынкам Румянцаў вельмі здаволены: «Не жалею, что удрал из Гомеля. РСФСР велика и обильна и один человек всегда в ней сумеет найти себе место. Ежели ты, Д., пожелаешь тронуться из этого Гомеля, я всегда к твоим услугам».

Канчаецца гэты ліст шматлікавымі прывітаньнямі і пацалункамі розным Рахілям і Розам, і адным кароценькім радком: «С небелорусским приветом Николай Румянцев».

Шчасьліў Румянцаў! Ён вырваўся з «гэтага Гомеля», ён еў сьліўкі на Кузьнецкім масту і сьліўкі гэтыя яму вельмі спадабаліся!

З свайго боку мы можам толькі прапанаваць увазе нашага паважанага поэты гэты фэльетон:

— «Кушайте пожалуйста!».

Міх. Гольдбэрг.

Абвяшчаем барацьбу за здароўе!

За лазьню, зубную шчотку, за лягер моладзі.

Асабістая гігіена, чыстата і ахайнасьць.

... Перш за ўсё трэба зьвярнуць увагу на захаваньне ў асабістым жыцьці чыстаты, парадку і ахайнасьці кожнага комсамольца паасобна.

„Гразь і няхайнасьць у асабістым жыцьці зьяўляецца найвялікшым злом у разьвіцьці здаровых навыкаў падрастаючага пакаленьня".

(З пастановы IX зьезду КП(б)Б).

«У першую чаргу неабходна ўпарадкаваць нагрузку ў працы актыву, прымаючы катэгорычныя захады да скарачэньня колькасьці і зацяжнасьці пасяджэньняў, скарачэньня камісій»

(З пастановы IX зьезду КП(б)Б).

Мае прапановы.

Я вельмі многа разважаў перад тым, як напісаць мае прапановы. Будучы досыць блізка знаёмы з весткамі мэдыцынскага агляду рабочай моладзі Беларусі, у мяне, узьнік цэлы шэраг думак, з якімі жадаю падзяліцца ўслух і знайсьці водгук з боку комсамольцаў—чытачоў газэты «Чырвоная Зьмена».

Дрэнна са здароў'ем.

Паглядзіш на весткі мэдагляду хаця-б апошняга году і становіцца «не па сабе» —57,3 проц. хворых... дрэнныя кватэрныя ўмовы... 10,7 проц. сухотнікаў... значны процант хваробы зубоў, вушэй, вачэй, хваробы жывата... нэўрастэнія і г. д. Міжвольна ўзьнікае пытаньне:

— Што рабіць? Як аздаровіць моладзь?

— Слаць на курорты, ў санаторыі?

— Слаць у дамы адпачынку?

— У амбуляторыю?

— Не, гэта яшчэ не збаўленьне!

— Не збаўленьне і вось чаму:

Калі-б мы, да рэчы, забралі усе мясцы ў дамох адпачынку Беларусі ад дарослых рабочых (а мы гэта рабіць не зьбіраемся), дык мы ня здолеем задаволіць патрэбнасьць моладзі ў дамох адпачынку. За сэзон мінулага году праз усе дамы адпачынку прашло 1735 дарослых рабочых, а прызначэньні для лячэньня атрымала 2505 чалавек моладзі ня лічачы тых, каго трэба было наслаць на курорты і перавесьці на больш лёгкую працу.

І гэтак, толькі дамы адпачынку і амбуляторыі не выратоўваюць становішча... Гэтым, зразумела, несказана, што дамы адпачынку справа дрэнная.

Дом адпачынку толькі зьвяно аздаравіцельнай работы.

Ці ўсё фізкультурнае ў „фізкультуры".

Адзін з мэтодаў аздараўленьня моладзі мы ведаем—гэта фізкультура. Аднак, нашая фізкультура ў вузкім сэнсе гэтага слова ня можа аздаровіць нашую моладзь. Досыць сказаць, што мы прызвычаіліся фізкультуру разумець толькі як гімнастыку і спорт.

Для больш шырокага разуменьня фізкультуры не падрыхтаваны нашыя інструктары, нашыя намашканьні і ў канцы канцоў сама моладзь.

Наш фізкультурнік ня чысьціць зубоў, рэдка наведвае баню, не мяняе па месяцах бялізну, неахайны, наш фізкультурнік —не фізкультурны.

Што-ж датычыцца не фізкультурнікаў, дык аб гэтым і гаворыць ня прыходзіцца. Прыглядзьцеся да санітарна-гігіенічных умоў нашага ячэйковага сходу. Звычайны малюнак такі:

Невялічкі пакоік. Народу поўна. Сядзяць ня толькі на лаўках і крэслах, але і на падаконьніках. Накурана. Ад дыму цежалее галава. Слухаеш даклад. Горача. Сядзіш у паліце і шапцы. Душна. Вось хлапчына голасна плюнуў амаль што пад стол прэзыдыўму. Фортачку ніхто і незда гадаўся адчыніць. Да хаты ідзеш разьбітым, зьмятым...

Гэта звычайны малюнак нашых сходаў.

У хаце кожнага комсамольца думаеце лепш?

Беспарадак... Гразь... Кнігі раскіданы... Койка ў беспарадку...

На прадпрыемстве таксама:

У «Ларку» каля фабрыкі заўсёды знойдзеш кілбасу, квас, гнілыя яблыкі, ня знойдзеш толькі малака... І рэдка на самым прадпрыемстве чай альбо вар.

А ячэйка...

Ячэйка гэткімі дробезямі не займаецца... Наша ячэйка не задумалася яшчэ над пытаньнем як абставіць жыцьцё комсамольца і рабочага хлапца больш культурна, сапраўды фізкультурна.

Ці ведае маса нашых комсамольцаў, што такое «профілактыка», ці ведае моладзь, што «хваробу лягчэй папярэдзіць чымся яе лячыць»? Ці ведае моладзь як усе гэтыя мерапрыемствы, прыгожыя рэчы ператварыць у жыцьцё?

Да гэтых часоў—няведаюць!

Часта ячэйка траціць шмат сіл і энэргіі на паседжаньні заводзкага камітэту, адстойваючы адно месца для 50 чалавек моладзі ў дом адпачынку, упускаючы з віду, што праца па аздараўленьню ня толькі тут...

Што-ж галоўнае?

Мне здаецца, што выйсьце з гэтага становішча будзе знойдзена толькі тады, калі праца па аздараўленьню стане задачай штодзённай працы ўсёй ячэйкі. Каб ня быць галаслоўным я вылучаю практычныя прапановы ў працы ячэйкі.

Ячэйка—павінна змагацца з курэньнем на сходах, павінна весьці барацьбу за разьдзяваньне на сходах і праветрываньне пакояў дзе адбываецца сход. Трэба прыняць усе заходы да скарачэньня працяжнасьці гэтых сходаў і паседжаньняў.

Ячэйка—павінна організоўваць колектыўнае наведваньне лазьні, наладзіць агляды гігіенічнага жыцьця ў хаце комсамольца. Гэты агляд служыць матар'ялам пры заслухоўваньні індывідуальных справаздач, трэба часьцей прыцягваць урача ў ячэйку.

Ячэйка—павінна паставіць пытаньне перад заводзкім камітэтам прадпрыемства аб закупцы малака на завод, альбо фабрыку да абедзеннага перапынку.

Ячэйка—павінна організоўваць колектыўныя экскурсіі ў вёску, у лягеры—падобна піонэрскіх, працяжныя экскурсіі з тэй моладзьдзю, якая атрымала свой чарговы водпуск.

Бязумоўна, усе формы аздаравіцельнай работы тут ня вызначаны. Іх трэба разьвіваць і дапаўняць на мясцох, у ячэйках.

І толькі такім чынам мы хутчэй папярэдзім высокія проценты хваравітасьці. Толькі тады ўся фізкультпраца будзе адпавядаць нашым запатрабаваньням.



Вось мае думкі. Лічу, што комсамольскія ячэйкі і комсамольцы выкажуць свае прапановы і думкі на закранутаму пытаньню.

Брадоцкі.

Ад рэдакцыі: чакаем водгукаў.

На танцы-мыецца

(Ячэйка ЛКСМБ, ст. Менск, Заходніх чыгунак).

Сяргей Абакун вядомы комсамолец у чыгуначным раёне г. Менску.

Калі вы сустрэнеце на вуліцы хлапца з расхрыстаным каўнерам у брудным кажуху, з шапкай на самай патыліцы—дык гэта ён.

Сяргей рэдка калі мыецца. Гэтыя рэдкія выпадкі бываюць толькі тады калі на тумбе ля вакзалу зьяўляецца афіша:

ТАНЦЫ ДА РАНІЦЫ.

Гэткіх „Сяргееў" шмат. Ячэйкі яшчэ ня думалі над тым, як з гэткімі хлапцамі змагацца. Я прапаную: правесьці анкету па ячэйках і па чарзе выклікаць комсамольцаў на бюро і абгаварваць іго паводзіны ў асабістым жыцьці.

Чыгуначнік.



АПОШНІЯ ДНІ ПЕРАВЫБАРА

Комсамольцы-сельсаветчыкі апраўдаюць надзеі мас!

Што сказала партыя, аб нашым удзеле

(Крупскі раён, Барысаўшчына).

Яшчэ за доўга да пачатку справаздачнай кампаніі сельсаветаў, на райконфэрэнцыі Комсамолу быў зроблены інформацыйны даклад аб перавыбарчай кампаніі і аб удзеле ў ёй комсамольскіх ячэек.

Потым гэтае пытаньне было добра прапрацавана на пасяджэньнях бюро райкому і былі даны практычныя ўказаньні ячэйкам аб формах удзелу іх у перавыбарах саветаў.

На раённым партыйным сходзе, дзе стаяў даклад аб перавыбарах сельсаветаў, прысутнічаў, таксама, і актыў комсамольскай організацыі. Акрамя гэтага, па ўсіх ячэйках, на сходах сялянскай моладзі былі зроблены справаздачы комсамольцаў сельсаветчыкаў аб іх працы за мінулы час.

Комсамольцы сумесна з партыйнымі ячэйкамі складалі сьпісы беднаты і заклікалі іх на сходы.

Неабходна адзначыць, што і **піонэры ў гэтай працы не адставалі.** Пытаньне аб іх удзеле ў гэтай кампаніі было прапрацавана на занятках зьвеньняў. Піонэры разносілі позвы па хатах, пасылалі сваіх бацькоў на сходы.

На сходах беднаты кандыдатуры комсамольцаў у сельсавет высоўваліся непасрэдна беднатой.

Комсамольцы прымалі актыўны ўдзел у скліканьні выбарчых сходаў шляхам разноскі павестак, агітацыі і інш. усіх выбарчых сходах яны прымалі г... чы ўдзел у спрэчках.

Усяго ў гэтую перавыбарную ка... нію выбранымі ў сельсаветы раёну ... залася **39 комсамольцаў, з якіх ... дзяўчына.** У мінулым-жа годзе было... брана ўсяго 30 чал. З гэтых 39 чал... браны старшынямі сельсаветаў 3 ко... мольцы, сакратарамі — 2, у рэвізыйную камісію—7.

Бюро райкому партыі адзначыла, **з боку комсамольскай організ... ўдзел у гэтай працы быў дас... ковы.** Посьпехі комсамольскай орга... цыі ў гэтай кампаніі трэба аднесьці ... актыўнасьці і дзелавітасьці самых ко... мольскіх ячэек.

Да недахопаў трэба аднесьці **не... татковае жывое кіраўніцтва з ... РК, малы лік дзяўчат у нававыбра... сельсаветаў, выпадкі парушэ... комсамольскай дысцыпліны.**

У далейшым Райкамол лічыць ... ходным рэгулярна склікаць нарады ... самольцаў-грамадзкіх працаўнікоў, у... **ваць дзяўчат** у працу камісій пры ... саветах, пэрыодычнае заслухоўваньне ... дадаў комсамольцаў-сельсаветчыкаў ... сходах комсамольскіх ячэек, так ... сходах усяе моладзі.

С. Льв...

Комсамольцы-саветчыкі.



Дэлегаты апошняй конфэрэнцыі Калінінскай організацыі ЛКСМБ

Бедната знае каго выбірае.

(Лядзянскі раён, Аршанчына).

На агульных сходах комсамольскіх ячэек яшчэ за доўга да перавыбараў сельсаветаў былі заслуханы даклады аб значэньні гэтай кампаніі.

Комсамольцы дапамагалі ў падрыхтоўцы да перавыбараў, дапамагалі склікаць сходы, а таксама і актыўна ўдзельнічалі на гэтых сходах.

Былі выпадкі, калі сяляне самі высоўвалі ў кандыдатуры комсамольцаў у сельсавет, кажучы, што:

— «Лепшага нам ня трэба, як гэты хлапец, ён умее добра працаваць».

Усяго комсамольцаў выбрана **19** чалавек, а ў мінулым годзе было толькі **12.**

А. Краўцоў.

У савет прашло палова ячэйкі.

(Н.-Маркавічы, Стрэшынскі раён, Бабруйшчына).

Напярэдадні перавыбарнай кампаніі на сходзе ячэйкі была распрацавана новая інструкцыя аб выбарах у сельсаветы, потым абгаварылі кандыдатуры комсамольцаў, якіх можна вылучыць на грамадзкую працу. У падрыхтоўчай працы кепска тое, што **ня быў праведзены дзень сялянскай моладзі.**

У сельсавет выбрана 3 комсамольцы. Невялікі лік комсамольцаў, абраных у сельсавет, тлумачыцца тым; што наша ячэйка організавалася ў 1925 годзе і налічвае ўсяго толькі 6 чалавек.

Міхась Якуткін

Хто абраны ў сельсаветы.

Перавыбары сельсаветаў па 10-ці акругах БССР ужо скончыліся. Усяго перавыбрана 1200 сельсаветаў.

У члены сельсаветаў абраны 18.449 асоб, з якіх 92,93 проц. мужчын і 7,4 жанчын.

Па партыйнасьці яны разьмяркоўваюцца наступным чынам: партыйцаў—11 проц., сяброў КСМ—10,4 проц. і беспартыйных—73,6 проц.

Каго выбірае...

— На выбарах у вёсцы **Вы... Горскага раёну** (Аршаншчына), ... сельсавет прашлі два комсамольцы ... сябрам, другі кандыдатам.

Я. БАРБА...

— У гэтым годзе у першы ра... браны 3 комсамольцы з **Асіпаўскай ... кі ЛКСМБ, Азярышчанскага ра...** сельсавет. Гэта тлумачыцца тым, ш... самольцы пачалі карыстацца пашан... род сялянства.

Я. ШАЙ...

Комсамольцам давяраю...

(Касьцюковіцкі раён, Пяч... скі сельсавет, Калінінш...)

У нас перавыбары сельсавету ... вельмі ўдала. Комсамольцы прыма... тыўны ўдзел як у падрыхтоўцы, ... часе самых перавыбараў. Усё насел... нашай мясьцовасьці было поўнасьц... нута ў гэтую кампанію.

У новы сельсавет абралі 4-х ... мольцаў і двух партыйцаў. Гэта г... нам, што комсамольская ячэйка ... ла сабе аўторытэт сярод сялянств... дадзеныя ёй дырэктывы з боку с... мітэтаў выканала.

Усе прапановы, якія высоўвалі... самольцамі на сходах—сяляне адо...

Комсамольцы, якіх выбралі ў ... вет, **яшчэ больш апраўдаюць д... васьць насельніцтва і паставяц... працу на належнюю вышыню.**

Комсамо...

Дзяўчат у сельсав...

Да 8-га сакавіка—міжнарод... работніц—ЦК даў дырэктыву вык... гэты дзень для высоўваньня дзяў... самолак на актыўную працу, як ... УсеЛКСМ, так і ў іншых грамад... тычных організацыях. У прыв... неабходна зьвярнуць сур'ёзную ... прыцягненьне дзяўчат да пера... саветаў і наладзіць таварыскую ... дзяўчатам, абраным у саветы.

СПРАВАЗДАЧА УРАДУ БЕЛАРУСІ

На трэцяй сэсіі ЦВК Савецкага Саюзу Рэспублік

Залі, калідоры, пераходы Вялікага Крамлёўскага палацу зноў перапоўнены народам, гудуць стрыманым гулам сотні галасоў.

Трэцяя сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту адчынілася.

Імяніньніца сеньня—Беларуская Соцыялістычная Савецкая Рэспубліка. Аб ёй робіць сягоньня **даклад тав. Адамовіч.** Як працуе рэспубліка, чаго ўжо дасягнула, чаго ёй не стае. Як праводзіць нацыянальную політыку, як нацыянальным меншасьцям Беларусі—палякам, яўрэям, расійцам — дадзена поўная магчымасьць працаваць і ствараць сваю культуру. Асабліва ўважліва да гэтага прыслухоўваюцца замежныя госьці. І ня дзіва. Шмат для каго з іх, і перш за ўсё для суседкі Беларусі—«Рэчы Паспалітай», гэта балючае пытаньне.

У Георгіеўскай залі, дзе пад высокімі скляпеньнямі чалавек здаецца маленькім-маленькім, Беларусь выставіла свае экспонаты. Яшчэ ўбіваюць цьвікі ў фанэру, яшчэ ня ўсе кнігі раскладзены.

Цікава складзеныя дыяграмы знаёмяць гледача з сельскай гаспадаркай Беларусі, з экономікай, з нацыянальным складам. Паказана мэліорацыйная работа. Барацьба з балотам адна з галоўных задач краіны. Балота займае вялікія абшары. Але крок за крокам, пядзя за пядзяю вырывае беларускі хлебароб па кавалку вязкай і змарнелай глебы. Праводзіць каналы, асушвае, засейвае здабытую ягэ лапатай зямлю.

Тая-ж ланата і цяжкая праца паляшука выпрэстваюць рэкі, накіроўваюць зьвілісты бег беларускіх вод у патрэбнае русла.

Асушваецца багна, якая сваёю гнілясьцю распаўсюджвае малярыю, праз яе праводзяцца дарогі. Мэліорацыйныя таварыствы сваімі машынамі разварочваюць нованароджаную глебу. І вось — беларускі селянін, сябра таварыства, зьбірае першыя ўраджаі аўсу, вікі, бульбы, капусты. Тут жа паказаны распрацоўкі торпу—тлустыя кавалкі торпу нарэзаныя машынамі.

Каля сталоў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва таўпяцца члены сэсіі. Тут «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя беларускай кнігі», зборнікі «Полымя», «Маладняк», «Чырвоны Сьцяг»... Нельга і пералічыць усіх выданьняў савецкай бел. літаратуры.

Газэты. Савецкія, якія выходзяць з першых дзён Чырвонай Беларусі, і—гэта асабліва цікава—закардонныя зарубежныя.

Вось нязвычайная рэдкасьць, якую з вялікай цяжкасьцю знайшла Беларуская дзяржаўная бібліотэка—гэта маленькая, пажоўклая ўжо газэта «Беларускі Партызан». Яна друкавалася ў нетрах і балотах, яна абвеяна смалою хвоі і парахавым шызым дымам. Яе выдаваў штаб беларускіх партызан у 1922 годзе. Вершы, адозвы да «братоў партызан» і «панскіх вешацеляў». Опэрацыйная сводка дзеяньня беларускіх партызанаў»—усё напоўнена настроямі напружанай барацьбы.

Зараз, калі ў перапоўненай, раззалочанай Андрэеўскай залі грыміць і перадаецца ў моцнагаварыцелі радыё прамова аб мірнай працы, аб мэліорацыйных работах, аб фабрыках, аб дзесяцінах, засеяных мужыцкім зернем—гэтыя маленькія пажоўклыя лісткі маюць асабліва важнае значэньне.

Д. Ф.

* * *

У рэзолюцыі па справаздачы тав. **Адамовіча** аб працы ўраду Беларусіі Сэсія ЦВК ССР, прызнала дзейнасьць ураду здавальняючай і адзначыла шэраг значных дасягненьняў. Для прапрацоўкі рэзолюцыі Сэсіяй вылучана камісія, старшынёй якой зьяўляецца т. Томскі.

На балотах заквітнеюць нівы!

Што карыснага ў працы Менскай Балотнай Станцыі.

У 1924-ым годзе ва ўсёй Савецкай Беларусі было 254 мэліорацыйных таварысть, а ў 1926 г.—506. У 1924 г. плошча, на якой праводзілася мэліорацыя, раўнялася 38.000 дзесяцін, а ў 1926 годзе—95.000 дзесяцін.

І побач з асушанымі балотамі, дзе летам зелянеюць новыя сенажаці, дзе ўпяршыню засьвістала сялянская каса—расьце ўсё грамадзкае і культурнае жыцьцё Савецкай Беларусі.

Чаго станцыя дамагаецца?

Галоўнай мэтай Менскай Балотнай Дасьледчай Станцыі ўяўляецца **выпрацоўка спосабаў культывізацыі беларускіх балотаў, якія былі-б даступны і зразумелы кожнаму селяніну і забясьпечвалі-б высокія сталыя ўраджаі.**

У Беларусі культура балотаў мае асаблівае значэньне. Пры агульным малазямельлі і беднаце глебы на кожную сялянскую сямью прыходзіцца **каля 4-х дзесяцін балотаў.** Калі гэтыя балоты будуць ператвораны ў культурны стан, то сялянская **гаспадарка Беларусі будзе мець поўнае забясьпечаньне агароднінай, хлебам, сенам і саломай.**



Мэліорацыйная канава на балоце пасёлку „Перадавы Беларус“, Магілеўскай акругі.

Праца Балотнай Станцыі распачата ў 1912 годзе. Асаблівага разьвіцьця дасягнула пасьля 1922 году. За час існаваньня Станцыі ёю праводзіліся працы па вывучэньню балотных глебаў, рабіліся досьледы з рознымі палявымі, лугавымі, агароднымі і садовымі расьлінамі. Вынікі досьледаў, якія ажыцьцёўлены ў гаспадарчым маштабе на палетках станцыі служаць у сучасны момант **кіраўніцтвам для земляроба.**

Практычнымі дасягненьнямі станцыі лічацца выпрацаваныя ёю спосабы культуры балотаў, магчымыя для ажыцьцяўленьня ў кожнай сельскай гаспадарцы Беларусі.

Станцыя ў час з 1912 да 1917 году выдавала часопісь «Болотоведение». Апрача паменёнага яшчэ выдадзена 15 паасобных выпускаў навуковых прац станцыі.

Станцыя праводзіць і вучэбную работу. Кожны год на станцыі праходзяць практычныя заняткі 10—12 асоб, скончыўшых вышэйшыя сельска-гаспадарчыя школы.

З раньняй вясны і да позьняй восені станцыю наведваюць многалікавыя экскурсіі сялян, аграномаў, чырвонаармейцаў, рабочых, вучняў і розных організацый.

Станцыя дапамагае суседнім земляробам, якія распачынаюць культуру балотаў, даючы ім розныя сельска-гаспадарчыя прылады, насеньне, парады і інш.

Б. **Ганжа.**

На асушаным балоце...

Неяк ня верыцца...

Было балота з дзікім мураўам калючых траў, з яе здрадніцкімі трасінамі. Расьлі нізкарослыя каравыя хвоі і кусты. Жыхарамі гэтага месца зьяўляліся толькі мыляёны камароў.

Уночы, калі спушчаўся чорнымі ценямі змрок, з задумчыва-застыўшага балота падымаўся лёгкі туман. Паветра, нездаровае, насычанае няпрыемным пахам, ціханька крыжавалі лятучыя мышы. Дзе небудзь на корч увабраўшыся глуха крактаў філін.

* * *

Ня верыцца...

Роўны кавалак плошчы, запарушаны сьнегам. Правады ідуць праз былое балота да самых будынкаў.

Гэта балотная станцыя. Віднеюцца маладыя фруктовыя дрэўцы. Умелая рука наакручвала іх войлакам каб не памерзлі.

Ад каравых дрэўцаў і кустоў не засталося амаль і сьледу. Толькі віднеецца на полі геомэтрычна роўны простакутнік хмызьняку. Гэта дзяржаўны запаведнік. Пакінулі кусочак балота для памяці.

Але мэліорацыя адбілася і на ім. З каравых балотных дрэўцаў—выцягваюцца ўжо стромкія і стройныя сасенкі і бярозкі Запаведнік губляе сваю першабытнасьць.

* * *

Навая зямля...

Так можна сказаць з поўнай упэўненасьцю, гледзячы ўлетку на гэту шыр зялёных пушыстых траў і поўныя налітыя каласы збожжа.

Так,—гэта новая зямля!

Нікчэмнае непатрэбнае балота дае тое, што не давала да гэтага часу «старая» зямліца Слуцкага чорназёму.

Апошні ўраджай даў сена з дзесяціны 650 пуд., бульбы з дзесяціны 2000 пуд.

Коняй ужо пачынае замяняць—трактар.

Станцыя думае зараз аб тым, каб як небудзь скарыстаць свой «фордзон» (назва трактару) да малацьбы.

Бачыў я «фордзона», які цяпер адпачывае ў адной з будынін станцыі і «фагнума»—шырокагрудага белага каня, які першым пацягнуў па балотнай глебе цяжкі «Хэрт Эвен»—балотны плуг. «Фагнум» мірна пережоўваў авёс і нешта коса пагляджаў на нас.

Жан **Лацінік.**



Пародзістая карова „Галяндэрка“.

Станцыя вывучае балоты Беларусі.

Хэмічная лябараторыя Балотнай станцыі займаецца вывучэньнем уласьцівасьці балотных глебаў і вады і абслугоўвае патрэбы дасьледчай працы на полі і вегетацыйным павільёне.

Праца лябараторыі праходзіла са значнымі перабоямі. У пачатку вайны ўвесь персонал лябараторыі быў мабілізаваны.



У часе окупацый усё абсталяваньне лябараторыі было вывезена ў Польшчу.

Напава організацыя лябараторыі распачата ў 1922 годзе, і толькі ў 1926 г. для яе было дадзена адпаведнае памяшканьне, у якім прадставілася магчымасьць разгарнуць належным чынам лябараторную працу.

Ня гледзячы на кароткі час працы лябараторыі, ёю сабраны значныя матар'ялы па дасьледаваньні беларускіх балотаў. У ліку выдрукаваных «працаў» Станцыі—тры выпускі маюць спэцыяльна працы лябараторыі.

Побач з гэтым лябараторыя праводзіць аналізы глебаў, вады і ўгнаеньняў для мэліорацыйных таварыстваў і ўстаноў Наркамзему.

У сучасны момант праводзіцца вялікая работа па дасьледаваньню тарфяных массываў Беларусі, якія намячаюцца для распрацоўкі на апал.

У лябараторыі звычайна праходзяць стаж 2-4 практыканты з ліку асоб, якія скончылі вышэйшые сельска-гаспадарчыя школы.

Г. Б.

Гаспадарка балотнай станцыі.

Дзе раней тапіліся людзі.

Менская Балотная Дасьледчая Станцыя была закладзена ў 1914 годзе на частцы Комароўскага балота, якое знаходзіцца ў чарце гор. Менску.

Торп гэтага балота мае таўшчыню пласта ў сярэднім палову сажэні.

Да перадачы ў карыстаньне Балотнай Станцыі, Камароўскае балота было пакрыта вадою, а ня так даўно яшчэ, як кажуць старыя жыхары, у цэнтральнай яго частцы былі зыбуны (трасіны) і бяда сустракала чалавека, калі ен пападаў на гэтыя багны-зыбуны.

На колькі страшнымі для чалавека былі гэтыя трасіны сьведчыць прыказка, якая ходзіць у народзе: «Каб ты ўтапіўся ў Камароўскім балоце».

Апрача гэтага, Камароўскае балота вельмі дрэнна адбівалася на гігіенічным стане гораду.

А хто з старых жыхароў Менску ня помніць удушлівага торфянога дыму, які ў сухія летнія дні разносіўся па вуліцах Менску?

Гэты дым таксама цягнуўся з таго-ж Камароўскага балота, краі якога ў сухія гады перасыхалі і выпадкова кінутая кім-небудзь гаручая запалка ўтварала пажар.

Савецкая ўлада прышла на дапамогу.

У такім стане гэта балота было да 1914 г.

У 1914 годзе па думцы профэсара А. Т. Кірсанава тагочаснага дырэктара Балотнай Станцыі, на паўночнай частцы гэтага балота была адчынена Дасьледчая Балотная гаспадарка.

Але імпэрыялістычная вайна і частыя окупацыі не дазвалялі гаспадарцы шырока разгарнуць навуковую і практычную працу. І толькі пасьля замацаваньня на Беларусі Савецкай улады, якая выказала вялікую зацікаўленасьць да справы мэліорацыі і культуры балот нашай Беларусі, балотная Гаспадарка стала на шлях хуткага разьвіцьця ў сэнсе пашырэньня свае як дасьледчай, так і практычнай працы і значна пашырыла плошчу культурнага балота.

Адведзеныя ў 1923 годзе 110 дзесяцін балота ўжо ў 1925 годзе былі цалкам асушаны і прыведзены ў культурнае становішча.

На месцы багнаў-зыбуноў сталі красавацца багатыя палі і агароды, зелянець прыгожыя высокаўраджайныя сенажаці, сады, ягаднікі і інш.

Асушка балота на Балотной Гаспадарцы праводзілася рознымі сыстэмамі дрэнажоў (закрытыя канавы) і адчыненымі канавамі. З іх дрэнажом асушано 42 і адчыненымі канавамі 68 дзесяцін.

Усё балота разьбіта на 3 севазвароты: **дзесяціпольны, сяміпольны і вольны.** Апрацоўка глебы праводзілася наступным шляхам: пасьля асушкі праводзілася раскарчоўка балота, потым ворыва спэцыяльным плугам Гэрд-Эвэна, альбо плугам Сакка, далей—распрацоўка ўзораных пластоў талеркавымі баронамі, і толькі тады ўжо ўносілася ўгнаеньне: 15-18 пуд. калійнай солі і 24 п. тамасшлаку на дзесяціну, пасьля чаго рабіліся пасевы.

НАШЫ УРАДЖАІ

У апошнія гады станцыя брала з дзесяціны балота ў сярэднім наступныя ўраджаі: **канюшыны з цімафееўкай**—340 пудоў; **шматгадовая мяшанка траў** дае 300 пудоў; **мяшанка** (віка з аўсом)—332; **жыта**—110; **авёс**—116; **ячмень**—116; **бульба**—1123; **турнэпс** (кармовая рэпа)—3000; **моркава**—1800; **бручка**—2000; **капуста**—2000; **каноплі**-зярна 50 пуд. і **пянькі**—35 пудоў.


Пасеў гэтых расьлін за апошнія гады мала таго, што зьвярнуў вялікія выдаткі на ўгнаеньне, вопыты і інш., а даў яшчэ станцыі **1313 рублёў** чыстага прыбытку.

Такім чынам, бачым, што нашы беларускія балоты, нават і багнавыя, якія служаць крыніцаю розных хвароб (каўтун, малярыя і інш.) магчыма ператварыць у вельмі карысныя землі, якія значна палепшаць дабрабыт селяніна і зьменшаць вастрату зямельнага недахопу.

Побач з практычна-дасьледчымі дасягненьнямі на Балотнай Гаспадарцы вялася і культурна-асьветна-прапагандыстычная праца: праводзіліся шматлікавыя экскурсіі (да 3000 чалавек за адно лета), чыталіся лекцыі, даклады для рабочых і сялян, праводзіліся курсы для сяброў мэліорацыйных таварысть, наладжваліся выстаўкі экспонатаў балотнай гаспадаркі ў Менску і акругах.

Э. Шыпэрка.

АД РЭДАКЦЫІ: калі хто з чытачоў зацікавіцца тым ці іншым закранутым ў гэтым артыкуле пытаньнем, дык зможа атрымаць праз газэту «Чырвоная Зьмена» ад станцыі больш падрабязговае тлумачэньне.



Талеркавая барана для вырабу асушанага балота.

Пабылі на экскурсіі—навучыліся.

(Дукора, Меншчына).

Некалькі дзён таму назад мне прышлося гутарыць з сялянамі **Дукорскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну,** якія мінулым летам прыяжджалі на Менскую Балотную Станцыю на экскурсію, організаваную шэфам—рабочымі сельска-гаспадарчых майстэрняў імя Бурбіса.

Адзін з іх, нізкаpослы, але моцны актывісты-бедняк Рыгор, усьміхнуўшыся ў бараду, сказаў:

— «І трэба-ж! Такі авёс вырас на балоце. А капуста ды бульба?—Як падняць!».

Другі селянін, серадняк з вёскі Жораўкі, Паўлюк парадаваў мяне:

— «Палюбаваўшыся ўраджаямі Балотнай Станцыі і перакапаўшыся ў карысьці асушкі балот—мы організавалі мэліорацыйнае таварыства. З вясны пачнем капаць каналы. А балота—балота ў нас! Дзесяцін тысяч дзьве».

І Балотная Станцыя навучыла ўжо так сотні беларускіх гаспадароў.

Юнвяскор.

Сялянства асушае балоты.

У мэліорацыйных таварыствах моладзі шмат працы

У нас не хапае 104 мільёны пудоў сена.

Павялічэньне колькасьці корму для жывёлы зьяўляецца галоўным пытаньнем сельскае гаспадаркі Беларусі, бо ад правільнага разрашэньня яго залежыць і правільнае разьвіцьцё паляводзтва і пашырэньне жывёлагадоўлі.

Гэтыя дзьве галіны гаспадаркі павінны разьвівацца ў поўнай пагоджанасьці паміж сабою.

Гэта становіцца вельмі важным асабліва ў Беларусі, калі сельская гаспадарка прымае жывёлагадоўчы, ўхіл для чаго ў першую чаргу трэба мець добрую сенажаць і добры выган.

Між тым, калі паглядзець на нашы звычайныя сенажаці ці выганы, то ня гледзячы на іх вялікія абшары—гаспадары атрымліваюць вельмі мала сена, да і то дрэннага.

Агульны збор сена з усіх сенажацяй Беларусі ў мінулым годзе быў каля 134 мільёнаў пудоў, а каб пракарміць жывёлу, якая ў нас ёсьць, трэба 238 мільёнаў. Агульны недахоп сена ў мінулым годзе раўняўся 104 мільёнам пудоў. Дзякуючы такому зьявішчу цана сена ў Менску, Магілеве і інш. гарадох даходзіла да 1 р. 50 к. за пуд.

Дзе мы можам узяць 221 мільён пудоў добрага сена?

Які-ж адсюль выхад?

— Пашыраць плошчу пасеву травы на мінаральнай глебе (пашні) немагчыма, бо ў нас ворнае зямлі нехапае для пасеву хлеба.

Застаецца адзін выхад—**паляпшаць свае звычайныя сенажаці і выганы і расшыраць іх за лік балот і забалочаных плошчаў,** якіх у Беларусі, у 10 акругах (апрача Рэчыцкай і Гомельскай) налічваецца 1.650.000 дзесяцін.

Большая частка гэтых балот застаецца яшчэ не скарыстанай.

З агульнага ліку балот і забалочаных абшар—737 тысяч дзесяцін ці 45 проц. знаходзіцца ў карыстаньні насельніцтва і 260 тысяч (16 проц.) застаюцца не раздадзенымі насельніцтву.

Калі ўсю гэтую нескарыстаную плошчу балот і забалочаных угодзьдзяў пеpавярнуць і зрабіць з яе сенажаці, то на падставе вынікаў атрыманых на асушаных балотах можна мець 300 пуд. сена з дзесяціны, а з усіх 737 тысяч каля 221 мільёну пудоў.

Такое павялічэньне дасьць магчымасьць насельніцтву ня толькі павялічыць забясьпеку кормам цяперашнее жывёлы, але яшчэ і павялічыць колькасьць жывёлы больш, як на палову.

Насельніцтва гэта зразумела і па магчымасьці праводзіць у жыцьцё.

Такі выхад добра зразумела само насельніцтва і пачало вельмі актыўна організоўвацца ў **мэліорацыйныя таварыствы,** рост якіх да гэтага часу апяраджаў усе тэхнічныя і экономічныя магчымасьці.

На першае кастрычніка мінулага году мэліорацыйных таварысть налічваліся 617, з агульным лікам сяброў 37.845 чалавек.

Савецкая дзяржава зацікаўлена ў асушцы балот.

Але праца па асушцы балот вельмі цяжкая і часам адсутнічаюць умовы для яе выкананьня.

Для дапамогі масам насельніцтва ў мэліорацыйнай галіне Савецкая дзяржава робіць усё ад яе залежачае. Выдаткі на мэліорацыю балот з кожным годам павялічваюцца. Калі ў 1924 годзе па бюджэту падала на гэту справу толькі 28 з паловаю тысяч рублёў, дык у 1926 годзе у балоты ўкладзена 951.985 руб.

Як бачым, дапамога насельніцтву з боку ўлады з кожным годам пашыраецца і значна павялічылася супроць тых выдаткаў, якія рабіліся ў першыя гады Кастрычнікавай рэволюцыі.

Вынікі ад такой дапамогі досыць вялікія. Насельніцтва організаваўшыся ў мэліорацыйныя таварыствы сваёй працаю (адпушчаныя сродкі ішлі галоўным чынам на прылады і матар'ял) **расчысьціла і раскарчавала—5443 дзесяціны; зрэзаны купіны—650 дзесяцін; узорана—280 дзесяцін; баранована—200 дзесяцін; угноена—87 дзесяцін і г. д.**

Апрача гэтага ў мінулым годзе насельніцтва выканала гідротэхнічных работ на суму ў 177.772 руб.

Такім чынам, мы бачым, што як дзяржава, так і насельніцтва робіць усё магчымае, каб як небудзь зьменшыць вастрату кармовага голаду.

Моладзь у карыснай справе—першая!

У правядзеньні ў жыцьцё ўсіх гэтых задач значную ролю адыгрывала і адыгрывае наша моладзь.

Калі паглядзець на кожнае мэліорацыйнае таварыства, курсы для членаў гэтых таварысть, экскурсіі і інш.—усюды наперадзі, заўсёды першай ідзе моладзь. **Асабліва гэта яскрава выяўляецца там, дзе трэба распачынаць рабіць што небудзь новае. Значную ролю,** калі ня выключную, **сыграла моладзь пры капаньні каналу імя Леніна ў Ма**гілеўскай акрузе.

У асобе моладзі тады, у час правядзеньня гэтай працы, мы мелі самую актыўную і дружную падтрымку.

Пятроўскі.

Мэліорацыя павялічвае плошчу ворнай зямлі.

Саюзныя навіны.

(У ЦК ЛКСМБ).

Ведаць пастановы 10-га зьезду.

ЦК ЛКСМБ даў дырактыву аб прапрацоўцы у ЛКСМБ наступных двух пытаньняў разабраных 10 зьездам КПБ:

Вынікі і задачы гаспадарчага будаўніцтва БССР;

КПБ на чале правядзеньня нац. палітыкі і культурнага будаўніцтва.

Прапрацоўку трэба праводзіць па тэзісах АПА ЦККПБ (тэзісы па першай тэме былі зьмешчаныу «Звезде» ад 2 лютага г. г.).

Прапрацоўку трэба правесьці да 1 красавіка. У гарадзкіх організацыях яна будзе праводзіцца на групавых сходах комсамольскіх ячэек.

У вясковых організацыях там, дзе магчыма, неабходна будзе прыцягнуць комсамольцаў на групавыя сходы партячэек а там, дзе такой магчымасьці няма —пажадана прапрацоўка пытаньняў па групавых сходах комсамольскіх ячэек.

Абсьледваньне вячэрніх ШСМ.

Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б вылучана камісія па абсьледваньню вячэрніх школ сялянскай моладзі.

У камісію ўваходзіць прастаўнік ЦК ЛКСМБ. Гэтымі днямі камісія выяжджае у Мазырскую і Калінінскую акругі.

За кваліфікацыю моладзі

ЦК КПБ зацьвердзіў матар'ялы аб організацыі ў Беларусі сельска-гаспадарчых школ для брові у саўхозах.

Таксама будуць організоўвацца школы канторскага і гандлёвага вучнёўства.

ЦК КПБ зьвярнуў увагу ЦСПСБ, Галоўпрофасьветы, Галоўпалітасьветы і ВСНГБ на неабходнасьць тэрмі овай распрацоўкі пытаньня аб організацыі курсаў папяредняй кваліфікацыі, курсаў ЦІП'а, курсаў майстроў, курсаў павышэньня кваліфікацыі і перакваліфікацыі, вячэрніх курсаў, вячэрніх школ рабочай моладзі, гурткоў профтэхнічнай асьветы і агульна-адукацыйных гурткоў.

Хто займаецца ў ШСМ

У 1926-27 навучальным годзе ў школах сялянскай моладзі займаецца батракоў—157, беднякоў—408, серадняков—315, заможных—23 і сельска-гаспадарчых арцеляў—16 чалавек.

Па нацыянальнаму складу: беларусаў—793, яўрэяў—94, палякаў—19, расійцаў—7, інш. нац.—6 чалавек.

Сяброў КПБ—8, кандыдатаў КПБ—32, сяброў ЛКСМБ—539, кандыдатаў ЛКСМБ—15, піонэраў—128, беспартыйных—197 чалавек.

Сярод маладнякоўцаў.

— Вышла з друку кніжка **А. Барычэўскага** „Тэорыя сонату“ у выданьні ЦБ „Маладняка“. Каштуе яна 35 кап.

— Гэтымі днямі будзе закончан **перавучот агульнага складу сяброў „Маладняка“**.

— Спэцыяльная камісія пры ЦБ „Маладняка“ распрацавала **праграмы для літаратурных гурткоў**.

— На адным з бліжэйшых сходаў Менскай філіі „Маладняка“ будзе заслухан даклад **„Есенін і ўпадніцтва ў Беларускай літаратуры“**.

З „Перамогаю“ атрымалі перамогу!

Першы спэктакль для моладзі ў Дзяржтэатры

Спэктакль прашоў з вялікім посьпехам.—Уся моладзь засталася здаволенаю гэтым новым культурным адпачынкам.—Тэатр—сур'ёзны вораг піўнушкі.—Спэктаклі для моладзі трэба наладжваць рэгулярна.

Праз 4 дні другі спэктакль!

Ячэйкі, ці закупілі вы білеты?

Другі агульнадаступны спэктакль для моладзі ў Белдзяржтэатры адбудзецца ў сераду, 23-га лютага. Пойдзе цікавая музычная п'еса «СТРАЛОК ТЭЛЬ». П'еса гэта малюе г роічную барацьбу швайцарскіх сялян за свае вызваленьне. П'еса пераплецена балетнымі і музыкальнымі нумарамі.

Білеты прадаюцца кожны дзень: днём у рэдакцыі «Чырвонай Зьмены», а вечарам з 8 гадзін у клюбе КІМ (Комсамольская, 25). Цана білетаў ад 15 да 75 кап.

„Сур'ёзныя папярэджваньні“

Калі абвясьцілі аб організацыі «Чырвонай Зьменай» і клюбам «КІМ» агульнадаступных спэктакляў для моладзі ў Дзярж тэатры, многія скэптычна ўхмыляліся і гаварылі:

— Нічога ў вас ня выйдзе... Ну, каму гэта патрэбна... А, глупствам займаецеся!

Іншыя «сур'ёзна папярэджвалі»:

— Праваліцца ў вас спэктакль... Што, ня ведаеце нашых комсамольцаў? Яны-ж разграмяць тэатр, часнае слова разграмяць!..

Аднак, ня гледзячы на гэтыя разважаньні, падрыхтоўчая організацыйная работа была праведзена і хутка прыступілі да продажу білетаў.

Штурм тав. Aроцкера

Валам павалілі ячэйкі за білетамі.

Днём у рэдакцыі, а вечарам у клюбе тав. Ароцкера (нашага касіра) бязупынна штурмавалі дэлегацыі комсамольскіх ячэек, прадпрыемстваў, вайсковых частак і г. д.

— Білеты, давай білеты!

— За колькі?

— Дуй па 30-ць 20 штук!

— 10-ць па 75!

— Для профшкольцаў па 15-ць!

— Для швэйпрому лёжу!..

Хто толькі ня прыходзіў га білетамі? Піонэры, прыбегшыя з школы з кніжкамі ў руцэ, сур'ёзныя, чынныя чырвонаармейцы, піскл вые швэйпромкі, няэграбныя гарбары, «бледналіцыя» вузаўцы, мэталісты, дрэваапрацовачнікі, друкары, нарпітаўкі—цэлая паводка!

Білетная кніжка «катастрофічна худзела».

За 3 дні ўсе білеты былі прададзены.

Асабліва азначыліся ў купілі білетаў ячэйкі: **Меншвэй** (70 б.), **Нарпіт** (70 б.), **тэкстыльшчыкаў** (40 б.), **Ф. З. В. гарбароў** (45 б.), **заводу «Дрэваапрацовачнік»** (45 б.), **шклянага заводу** (30 б.), **колектыў А. Б. В. Ш.** (40 б.) і інш.

Дэлегацыі ад ячэек не пераставалі хадзіць і пасьля таго, як ад білетнай кніжкі засталіся адны... карашкі.

Прыходзілі ў рэдакцыю, патрабавалі білеты і, калі даведваліся, што апошніх ужо няма, «з сэрцам казалі»:

— Чорт вазьмі нашага АПА... Ня мог раней паклапаціцца!

Таму, што білетаў ужо няма, аднак, ня верылі. Многія хадзілі на завод да тав. **Ароцкера** з патрабаваньнем безадкладна прадаць білеты, на што, зразумела, атрымоўвалі адмоўны адказ...

А ў гэты момант у піўных...

— Як наведвае моладзь Ляхаўскага раёну піўнушкі? Куды сёньня пашлі хлопцы—у тэатр, ці ў піўнушку?

Гэтыя думкі нахлынулі на супрацоўніка «Чырвонай Зьмены» ў часе другога акту. Ён ціха прасьлізнуў між радоў партэру. Спусьціўся па сходах фойэ.

Рамізьнік, ліха гікнуўшы, памчаў яго ўніз па Энгельсаўскай у кварталы Ляхаўкі. Застанавіліся ля першай піўной, што ў маста над Сьвіслаччу. Зайшоў. Паўзмрочна. У адным пакоі цёмна—пагашаны сьвет. У другім пакоі сядзела трое старычкоў з «благадушным» выразам твару. Яны, відаць, здорава «дзюбнулі». Ніводнай маладой фізіономіі!

Далей! У другой піўной было крыху весялей, але зноў такі—ніводнага маладога твару. У трэцяй—тое самае...

Разачараваўшыся злавіць комсамольцаў «на месте преступления» рэпорцер памчаў назад у тэатр.



Аўдыторыя Белдзяржтэатру 16 лютага. У авале—тав. Ароцкер.

У сераду вечарам.

Яшчэ няма 8 гадзін, а тры ярусы Дзяржтэатру ужо гудуць і хвалююцца. Цудоўнае зьявішча ў старым акадэмічным будынку! Вакол выключна маладыя твары. У кожным кутку—моладзь.

Як добра рушыцца па вузкаму калідору ў гэтай роднай, знаёмай кампаніі... Ва ўсіх якіясьці сьвяточныя твары, хоць ніякага сьвята няма. Ажыўленыя размовы, жарты, сьмех.

У першых радах партэру—ляхаўскія гарбары: яны «буржуі»—купілі білеты па 75 кап.! Наверсе, з галеркі зьвесіліся профшкольцы і зусім недысцыплінавана пераклікаюцца з партэрам.

У лёжах другога ярусу—швэйпромская армія. Туды кідаюць прагавітыя погляды з ліцерных лёж.

Сыгналы, цёмна. Над заслонай запальваюцца словы: **Перамога**. І адна за другой замігацелі яскравыя кароткія сцэнкі... Вёска, партызаны, польскія афіцэры, скокі, фронт, завод, узрыў, цягнік... Усе зразумела, усё знаёма. Кожная ўдалая рэпліка падхоплівацца гучным узрывам маладога сьмеху і шумнымі воплескамі.

П'еса ў распале.

„Лепей і ня трэба“!

А там ужо быў апошні антракт...

На сходах курылі хлопцы. Абменьваліся ўражаньнямі.

— Добрае гэта мерапрыемства—масавы спэкталь... Лепей і ня трэба!

— Сапраўдны культурны адпачынак! Трэба наладжваць рэгулярна!

Сыгнал паклікаў назад на месцы.

А праз паўгадзіны моладзь выходзіла з Дзяржтэатру на бадзёрую асьнежаную вуліцу.

У лыжнікаў

Менскім Акрсаветам фізкультуры камандзіруюцца на ўсебеларускія спаборніцтвы лыжнікаў у гор. Магілеў каманда з чатырох чалавек у складзе т. т. Зубрыцкага, Валхонскага, Дрозд і Добжанскай (апошнія дзьве—дзяўчаты).

У нядзелю адбудзецца агульна-гарадзкое выступленьне лыжнікаў-спартсмэнаў, прысьвечанае перавыбарам Гарсавету.

Акруговыя зьлёты комсамолії.



На БССР заканчваецца паласа акруговых комсамольскіх конфэрэнцый.

Ужо прашлі конфэрэнцыі амаль ва ўсіх акругах.

На 3-х конфэрэнцыях—Барысаўскай, Аршанскай і Калінінскай—заслуханы даклады прадстаўнікоў газэты «Чырвоная Зьмена» аб працы рэдакцыі. У прынятых пастановах праца рэдакцыі знойдзена здавальняючай Дадзен шэраг паказаньняў.

На здымцы—дэлегаты 3-ай акруговай Калінінскай конфэрэнцыі аднагалосна прымаюць рэзолюцыю па **дакладу рэдакцыі нашай газэты**.

У Віцебскай Комсамоліі

(Ад нашага карэспондэнта)

„Гурткі першай дапамогі“

Па ініцыятыве Віцебскага АК ЛКСМБ па шэрагу прадпрыемстваў гораду організаваны з дзяўчат **„гурткі першай дапамогі“**, дзе яны побач з вывучэньнем вайсковых ведаў будуць вывучаць санітарыю.

Вядуць за сабой масу

Праведзен абгляд становішча комсамольскай працы ў тэхнікумах. Выявілася што ў параўнаньні з мінулым годам гэта праца значна палепшылася. Комсамольскія ячэйкі тэхнікумаў карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод беспартыйных і вядуць за сабой усю студэнцкую масу. Побач з гэтым ёсьць і недахопы, як на прыклад: пэсімізм у некаторых комсамольцаў-студэнтаў, слабае парткіраўніцтва і інш.

АК ЛКСМБ зьвярнуў увагу ячеек на неабходнасьць зьнішчэньня гэтых дэфэктаў.

Віцебск—Ленінград—Волхаўбуд

Акругком ЛКСМБ супольна з АК фізкультуры абмяркоўвае пытаньне аб організацыі **масавага турызму моладзі.** Па ініцыятыве АК юнсэкцыя клюбу мэталістаў організоўвае экскурсыю па маршруту: Віцебск—Ленінград—Волхаўбуд—Віцебск.

„Чырвоную Зьмену“—на лаву падсудных.

Па цікаваму пачыну Менскай юнсэкцыі Дому Працасьветы, віцебская ячэйка саўгандлслужачых праводзіць політычна-грамадзкі суд над газэтай „Чырвоная Зьмена“. Для прыняцьця актыўнага ўдзелу ў правядзеньні суда прыцягваюцца ўсе ячэйкі 1-га раёну Віцебску.

Зьезды гармaністых

26-27-га лютага гарадзкім райкомам ЛКСМБ праводзіцца раённы зьезд гармaністых, цымбалістых і балалаечнікаў. У хуткім часе такія зьезды правядуць і астатнія райкомы ЛКСМБ, пасьля чаго будзе склікан акруговы зьезд.

На экране

„Панове Скаціны“

Стужка малюе кацярынінскую эп...

У далёкай глушы загубіўся маён... закаханых таўсьцякоў паноў Скацінін... у якіх ёсьць сынок - дурань Мітрафан... ка. У маёнтку Скацініных жыве бел... дзяўчынка Зоська. Зоську паны Скацін... хочуць аддаць замуж за свайго свая... Тараса Скацініна. Але калі Зоська н... кана атрымоўвае багатую спадчыну... свайго дзядзькі, яе ўжо хочуць ад... замуж за дурня-Мітрафанушку. Між... прыгожая Зоська мае другога каха... Гэта - афіцэр Мілон. Мілон у паходзе,... змагаецца з пугачоўцамі...

Зоську вянчаюць з Мітрафануш... але спрытнаму Мілону ўдаецца ўкра... сваю каханку з пад шлюбу...

Побач з гэтым разгортваецца дру... драма. Цішка-панскі халоп і дваро... дзяўчына Глаша моцна кахаюць а... другога. Пан Скацінін прабуе згвалц... Глашу, але гэта яму не ўдаецца. Ск... ніны спаганяюць злосьць над сваімі... лопамі - Цішкай і Глашай...

Вялікіх эьдзекаў ня стрымаць! Ц... ка і Глаша бягуць у стан пугачоў... Разгортваецца барацьба пугачоўца... панскім маёнткам. Нарэшце, Глашу в... раюць у палон, дзе яе замучваюць...

Тут да сюжэту фонвізінскага „Н... росля“ дабаўлены малюнкі з жыц... прыгонных сялян і барацьбы пугачоў...

Трэба сказаць, што гэтыя два сюж... ня вельмі добра склеены паміж сабою...

Але усё-ж такі фільма дасягае св... мэты!

Яшчэ раз напамінаем Белдзяржк... аб беларускіх надпісах. Тут ляпсусы... тараюцца. Напрыклад, па расійску н... сана „гости приехали на свадьбу“, а... беларуску—„госьці прыехалі на ра... і многа інш.

Ужо час навучыцца даваць гра... ныя надпісы!

Кіно-хроніка.

— Пачалася праца па здымцы но... кіно-фільмы вытворчасьці Белдзяржк... пад назвай **„Гірш Лекерт“**.

— Белдзяржкіно вызначыла ў... жэйшы час прапусьціць праз Мен... кіно-тэатры наступныя кіно-філь... **„Мисс Менд“, „Тарас Шевченко“, „Т... польская трагедия“, „Предатель“** і ін...

У тры радкі.

○ Белдзяржкіно закупіла 5 но... кіно-перасовак, якія ў хуткім часе... дуць накіраваны ў вёску.

○ Пры Менскім доме Чырво... Арміі організаваны наступныя ваен... габінэты: стралковы, інжынэрны і а... хэмічны.

○ Па БССР існуе 55 політшкол і... політгурткоў, якія ахопліваюць 28... комсамольцаў.

○ У чацьвер, 17 лютага распача... ся справаздачная кампанія Менск... Гарсавету.

Апавяшчэньні.

Менакругком ЛКСМБ выклікае на ч... верг 24-га лютага ў 3 гадзіны дн... АК ЛКСМБ (Польбюро) наступных т... рышоў:

Варшаўскага (фабзавуч ску... каў), **Запольскага** (сельска-гаспа... чыя майстэрні), **Савіцкага** (завод «... тал»), **Боздаха** (зав. «Зара»), **Та... рыніцкага** (сакратар яч. Нарсув...), **Вылотера** (яч. Эльвод), **Савіцку...**

У суботу 19-га лютага рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» сумесн... з ЦБ ЮП ЦК ЛКСМБ і Менскі... Бюро ЮП склікае нараду па пытаньню:

„Організацыя досугу піонэраў і набыцьцё імі тэхнічных ведаў“

Нарада адбудзецца ў памяшканьні фойэ Дому Працасьветы (Комуні... стычная вул.); пачатак а 7-й га... дзіне ўвечары.

На нараду запрашаюцца: павадыры атрадаў Менску, пэдагогі, урачы і бацькі піонэраў. Акрамя гэтых таварышоў пэрсональна запраша... юцца члены колегіі соцвыху НК... і члены мэтодычнага камітэт... НКА і Акрана.

Акрамя гэтага запрашаюцца на на... раду ўсе таварышы, якія ціка... вяцца пытаньнямі піонэрскага руху.

Рэдакцыя газ. «Чырвона... Зьмена», ЦБ ЮП ЦК ЛКСМБ... Менакрбюро ЮП.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Комсамольскі білет № 697 на... С. Н. Карэмава, выдадзены Менскім... ЛКСМБ.

— Сяброўскі білет за № 432 на... **М. І. Арановіча**, выдадзены Ме... ЛКСМБ.

— Сяброўскі білет за № 8467 на... **Л. Контуша**, выдадзены МенАК ЛК...

Хто з комсамольцаў лепшы стралок?

Гэта пакажуць стралковыя спаборніцтвы 27-га лютага

Менакругком ЛКСМБ сумесна з АСФК праводзяць стралковыя спаборніцтвы на лепшага стралка—комсамольца. 23-га лютага ў 5 гадзін дню ў ціры Дому Чырвонай Арміі адбудзецца папярэдняя трэніроўка ўдзельнікаў спаборніцтваў, а 27-га самі спаборніцтвы.

Кожная ячэйка, кожны ваенны гурток павінны вылучыць сваіх лепшых стралкоў для ўдзелу ў спаборніцтвах!

Адказныя рэдактары **А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 23993 2 Дзяржрукарня БДВ.